спаўненьня ідэалу незалежнасьці нашага разьдзеленага ваенным фронтам Беларуска–Літоўскага Краю ў найцясьнейшай сувязі з Курляндзіяй і просячы зашчыты ад усялякіх спроб новых разьдзелаў беларускай зямлі. Цяпер, карыстаючы з бытнасьці В[ашай] Эксцэленцыі ў сталіцы нашага Краю, Вільні, мы, прадстаўнікі арганізаванага беларускага грамадзянства ўсіх сацыяльных слаёў і палітычных кірункаў, зьвяртаемся да В[ашай] Эксцэленцыі з просьбай даць свой аўтарытэтны адказ на трывожачыя нас усіх пытаньня аб будучыні нашага народу і Краю, цьвёрда веручы, што справядлівыя нашы жаданьня неразьдзельнасьці і незалежнасьці нашай Бацькаўшчыны знойдуць у цэнтральных дзяржаў[6] сымпатыю і падтрымку.

## Яго Сьветласьці пану начальніку ўпраўленьня Litauen у Вільні

У мэмарыяле, пасланым на імя Імпэрскага Канцлера 19.IX.1917 за подпісамі 40 прадстаўнікоў беларускага грамадзянства[1], і ў пададзенай Вашай Сьветласьці рэзалюцыі беларускага мітынга 30.IX.17 беларусы высказалі ўжо свае дамаганьня ў справе арганізацыі *ўпраўленьня* нашым Краем *на час вайны*. Цяпер, з прычыны таго, што ход палітычных здарэньняў з кожным днём набліжае мамэнт разьвязкі пытаньня аб далейшай долі Беларуска–Літоўскіх зямель, мы, прадстаўнікі арганізаванага беларускага грамадзянства, складаем на рукі Вашай Сьветласьці ніжэйпісаныя дамаганьня нашага народу ў справе *палітычнай будучыны* нашай Бацькаўшчыны *пасьля вайны* і просім тэлеграфна пераслаць іх Імпэрскаму Канцлеру[2].

Прынімаючы пад увагу:

1. што Беларуска–Літоўскія землі становяць суцэльны праўна–дзяржаўны і эканамічна–гаспадарчы комплекс, утвораны вякамі як з прычыны супольнай дзяржаўнасьці ў постаці незалежнага В. Кн. Літоўскага, так і з прычыны геаграфічных варункаў, супольнай сыстэмы дарог — чыгунак, рэк, шасэ і т. п. і супольнай таргова–прамышленай арганізацыі;
2. што агульныя эканамічныя варункі жыцьця краю вымагаюць свабоднага доступа да мора, а сыстэма дарог і рэк зьвязывае яго асабліва з портамі Балтыцкага мора праз Курляндзію;
3. што ўсе акупаваныя Беларуска–Літоўскія землі становяць аснову колішняга незалежнага В. К. Літоўскага, каторае ўжо пры сваіх нарадзінах складалася з двух народаў: літоўскага і беларускага,

— мы, ніжэйпадпісаныя прадстаўнікі беларускага арганізаванага грамадзянства, высказываем трэбаваньне Беларускага народу, каб Беларуска–Літоўскія землі акупацыі станавілі *незалежную сувэрэнную дэмакратычную дзяржаву,* зложаную зь дзьвёх аснаўных аўтаномных нацыянальных тэрыторый: Беларускай і Літоўскай, у найцясьнейшай еднасьці з Курляндзіяй.

Беларускае грамадзянства горача[3] жадае, каб у імя права на непадзельнасьць беларускага народу, разрэзанага лініяй фронту, і ў імя еднасьці ўсіх Беларуска–Літоўскіх зямель да памянёнай гасударственай арганізацыі, заўсёды станавіўшай ядро В. Кн. Літоўскага, была далучана і рэшта Беларускіх зямель, як часьць да цэлага.

Мы заяўляем, што беларускае аранізаванае грамадзянства — у мысьль вышэйсказанага — у сваей шырэйшай палітычнай арыентацыі лічыць канечне патрэбным апірацца на тую з суседніх вялікіх дзяржаў[4], за каторай мір умацуе панаваньне на[5] ўзьбярэжжы Балтыцкага мора, канечне патрэбным да жыцьця і свабоднага разьвіцьця нашага Краю.